■ Беларусікі

# Маленькая бунтарка



«Нам вельмі спадабалася гісторыя пра маленькую падарожніцу Ксенію Бём *(«Звязда» ад 05.10.2017).* Захацелася таксама падзяліцца фотаздымкам сваёй дачушкі. Нас, бацькоў гэтай прыгажуні-беларусачкі, звязала любоў да нямецкай мовы. Мы пазнаёміліся ў Германіі, там жа нарадзілася і дачка Аліна. А пасля вучобы, нягледзячы на магчымасць застацца, вярнуліся на радзіму.

Дачка, каб паказаць сваю адметнасць перад аднакласнікамі, часта сцвярждае, што яна «немка», бо нарадзілася ў Германіі. Але ёй далёка да нямецкай акуратнасці і педантычнасці! Затое бунтарства і ўпартасці ў яе — цераз край! Больш за ўсё яна не любіць фатаграфавацца.

Толькі яе настаўніцы са студыі малявання ўдаўся вельмі прыгожы кадр, які арганічна ўпісаўся ў гарадскі пейзаж. Ён адлюстроўвае непаўторны дух дзяцінства, які мы, дарослыя, на жаль, ужо згубілі. Таму, бацькі, гледзячы на гэты здымак, не забывайце, адкуль мы родам. Будзьце смелымі, як у дзяцінстве, і верце ў свае мары!»

***Шаноўныя мамы і таты, бабулі і дзядулі! Шчыра запрашаем вас прыняць удзел у конкурсе «Беларусікі». Дасылайце здымкі вашых дзетак, унукаў, а можа, нават і праўнукаў (з невялічкім аповедам) на адрас «Звязды». Але адна ўмова — каб, зірнуўшы на фота, адразу ж можна было зразумець, што гэта беларусік. Арыгінальнасць і творчы падыход вітаюцца! Аднаго з герояў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз!***

■ Майстар-клас

# ПАДАРУНКІ СВАІМІ РУКАМІ

**Хочаце стыльна ўпрыгожыць дом альбо зрабіць падарункі родным да Новага года? Зазірніце ў крамы, дзе прадаюцца тавары для рукадзелля. Убачыце багата матэрыялаў, пры дапамозе якіх можна ствараць шыкоўныя рэчы. А вось як разабрацца ў розных тэхніках, вашых дзетак ды вас (праводзяцца заняткі і для дарослых) могуць навучыць у цэнтрах дадатковай адукацыі. Між іншым, у некаторыя гурткі можна запісацца і сёння.**



Кераміка і салома, бісер і шаўковая стужка (вышываць ёй могуць нават дзеці, у якіх ёсць праблемы са зрокам), — далёка не ўсе матэрыялы, з якімі чаруюць у сталічным Цэнтры тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі «Зорка». Тут навучаць нават, як зрабіць букеты з палімернай гліны, ды такія, што ад сапраўдных кветак адразу не адрозніш, альбо аўтарскія лялькі, падобныя на тыя, што прадаюцца ў сувенірных лаўках. Але гэтым разам мы завіталі сюды на майстар-клас, каб даведацца, як рабіць навагоднія падарункі.

— Нічога не выкідайце. Любому кавалку тканіны знойдзецца прымяненне. З мешкавіны, напрыклад, можна пашыць цудоўныя елачкі, пасля іх пафарбаваць, штучна «састарыць» і аздобіць гузікамі розных колераў і памераў, — падказвае **кіраўнік студыі тэкстыльнага дызайну Ірына ДЖУМАЕВА.** — З пражы мы пляцём бранзалеты, цацкі — апошнія можна павесіць на ёлку або выкарыстаць у якасці бірулькі для ключоў. Калі над вырабамі карпеюць зусім маленькія дзеці, якія толькі вучацца шыць, і ў іх не зусім роўныя атрымліваюцца шыўкі, — не бяда. Краі можна пафарбаваць акрылавымі фарбамі. Шапачка з пражы таксама можа быць выдатнай цацкай на ёлку, а зрабіце яшчэ шалік — і надзеньце ўсё на бутэльку шампанскага — вось вам і дэкор да навагодняга стала.



Падчас майстар-класа мы рабілі прыгожую цацку на ёлку з фетру. Яе выраб заняў менш чым гадзіну. Спачатку трэба стварыць малюнак, а на яго аснове — выкрайкі. Каб зрабіць сабачку (сімвал 2018 года), нам спатрэбіліся дзве дэталі з белага фетру і дзве для пярэдняй і задняй частак галавы — з карычневага. Ніткі мулінэ падбірайце пад колер матэрыялу. Дэталі можна злучыць шыўком «уперад іголка». Каб зрабіць сабачку аб'ёмным, выкарыстоўвайце напаўняльнік (напрыклад, вату). А яшчэ дэталі можна склейваць (гарачым пісталетам альбо клеем). Хочаце — вышывайце роцік, альбо намалюйце акрылавымі фарбамі ці контурам па тканіне. Тая ж варыятыўнасць з вырабам носіка і вочак — іх можна купіць гатовыя, вышыць, зрабіць з кавалка фетру ці пацерак. Дадайце атласную стужку (ці скруціце, напрыклад, дзве ніткі мулінэ) — і можна вешаць на ёлку. Калі прымацуеце зашпільку — атрымаецца стылёвая брошка.



А яшчэ з фетру па такім жа прынцыпе можна зрабіць Дзеда Мароза. Нам прапанавалі замацаваць яго на драўлянай палачцы. Такі элемент дэкору для гаршка з кветкамі будзе арыгінальным падарункам маці ці бабулі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

## СВЯТОЧНЫЯ РЭЦЭПТЫ

### САЛАТЫ ДА НАВАГОДНЯГА СТАЛА

#### «Чароўны водар»



***Спатрэбіцца:*** *курынае філе — 200 г, морква па-карэйску — 200 г, яйка — 3 штукі, свежы агурок — 1 штука (грам на 200), сыр цвёрды — 50 г, маянэз, соль.*

Курынае філе адварыць у падсоленай вадзе, астудзіць і нарэзаць кубікамі.

Вараныя яйкі і агуркі, вычышчаныя ад скуркі, таксама нарэзаць кубікамі. Дадаць надзёрты на тарку сыр, моркву па-карэйску. Запраўляем маянэзам і, пры неабходнасці, солім.

#### «Прага»



***Спатрэбіцца:*** *курынае філе — 300 г, яйкі — 4 штукі, морква — 2 невялікія, цыбуля — 2 сярэднія, 200 г кансерваванага гарошку, два салёныя агуркі, чарнасліў без костачак — 150 г, алей, маянэз.*

Курынае філе нарэзаць тонкай саломкай, цыбулю — паўколамі. На патэльню з алеем пакласці цыбулю, абсмажыць і за пару хвілін да таго, як згатуецца дадаць нарэзанае курынае філе і патрымаць на агні, памешваючы, яшчэ некалькі хвілін. Моркву адварыць і надзерці на буйной тарцы. Вараныя яйкі нарэзаць кубікамі. З гарошку зліць вадкасць. Салёны агурок дробна парэзаць.

Чарнасліў добра прамыць у гарачай вадзе, абсушыць пры дапамозе папяровага ручніка і палову нарэзаць дробна.

У вялікі салатнік, выкласці моркву, яйкі, мяса з цыбуляй, гарошак, агурок, здробнены чарнасліў. Усё добра змяшаць. Заправіць маянэзам, дадаць соль і чорны молаты перац на смак. Зверху на салаце зрабіць сетачку з маянэзу і выкласці цэлы чарнасліў, які застаўся.

#### Са свежай капусты



***Спатрэбіцца:*** *свежая капуста — 500 г, 1 бляшанка кукурузы, вэнджаны каўбасны сыр — 200 г, 3 вараныя яйкі, маянэз, 1 балгарскі перац, зеляніна кропу.*

Сыр надзерці на тарцы. Яйкі нарэзаць невялікімі кубікамі, перац — крыху большымі кубікамі, з кукурузы зліць сок. Нашаткаваць тонка капусту і паціскаць рукамі.

Змяшаць усе інгрэдыенты і запраўіць маянэзам, пры неабходнасці пасаліць. Упрыгожваем кубікамі перцу і зелянінай.

## ВАРТА ВЕДАЦЬ

• Адварваючы курыную грудку для святочнай салаты, трэба кінуць у ваду разрэзаную на чвэртачкі чырвоную цыбуліну разам з шалупінай. Мяса набудзе прыемнае ружовае адценне!

## ЁСЦЬ ІДЭЯ!

### МАСКАРАДНЫЯ КАСЦЮМЫ АД МАМЫ



• Дзяўчынкі, часцей за ўсё, хочуць быць прынцэсамі або феямі. Вядома ж, яны не адмовяцца ад касцюма анёла. Для яго стварэння спатрэбяцца матэрыялы, якія заўсёды пад рукой. Скотч, кардон, трохі дроту і вось ваша дачушка ператвараецца ў светлага анёла. Усё, што трэба зрабіць — гэта крылы і німб, падабраць белую сукеначку.



• Пацешнае бязважкае воблачка парадуе ўсіх сваёй мяккасцю і прыгажосцю. У гэтым касцюме дзіця можа свабодна танцаваць або гуляць. Для яго стварэння неабходны сінтэпон і крышачку цярпення — клеім або прышываем кавалачкі сінтэпону на старое адзенне. І вуаля! Касцюм воблака гатовы.

• Выдатная ідэя — домік на спіне і рожкі — атрымаўся мілы смоўжык. Зрабіць такі касцюм зусім нескладана. Скручваем з абгортачнай (крафт) паперы аб'ёмную хатку ў форме спіралі, замацуем яе як заплечнік на спіне. Пацешныя рожкі робяць таксама з паперы, скамячыўшы яе, і яркіх мячыкаў. Мацуюць іх на абруч для валасоў.



*«КАБ БЫЦЬ У ПАМЯЦІ ДЗЯЦЕЙ ЗАЎТРА, ТРЭБА БЫЦЬ У ІХ ЖЫЦЦІ СЁННЯ» (Барбара Джонсан).*

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.